УДК 141.30

# Сучасны неатамізм

Анцыповіч М. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Напрыканцы XX ст. Еўропа канчаткова трапляе ва ўладу секулярызацыі, і гэта неабавязкова атэізм, а проста нейкая заземленасць існавання ў грамадстве, вытворчасці і спажывання тавараў і паслуг, калі ў чалавека ўжо няма аніякай усвядомленай веры ў што–небудзь за межамі звычайнасці. Крушэнне ідэалаў у эпоху постмадэрнізма падштурхнула філосафаў–тамістаў зноў падняць пытанне аб надзённасці класічнай тэістычнай метафізікі быцця. У цэнтры ўвагі сучаснай тамісцкай думкі прысутнічаюць праблемы хрысціянскай філасофіі, метафізікі, гнасіялогіі, суаднясенне веры і і ведаў, філасофіі і багаслоўя, навукі і рэлігіі.

Выйсце з ідавочнага светапогляднага крызіса развівалася па двух напрамках: варыянт Карла Ранера, які імкнуўся да сінтэзу тамізма, як першаснай філасофіі, з гістарычным быццём чалавека. Трансфармацыя метафізікі ў філасофскую антрапалогію дазволіла тамізму пераадолець крытыку “новай тэалогіі” і працягнуць свой дынамічны рух сфарміраванага пасля II Ватыканскага сабора (1962 г.) дактрынальнага плюралізма. Але найбольш вырашальны ўплыў на пашырэнне тамізма і тамісцкай метафізікі, як самастойнага філасофскага напрамку, зрабілі працы Э. Жыльсана і Ж. Марытэна, якія абгрунтоўвалі, што Тамаза Аквінат (Фама Аквінскі) ужо ў свой час быў экзістэнцыялістам у дакладным сэнсе гэтага слов, і быццё ім разумелася не як сутнасць (essential), але як акт існавання (actus essendi). У рамках нэатамізму выяўляецца недастатковасць класічных катэгорый тамізма для філасофскай рэфлексіі над праблемай чалавечага жыцця і экзістэнцыяльнай сітуцыі чалавека ў сённяшніх рэаліях. Фармальнае апісанне чалавека ў схаластычных тэрмінах “сутнасць”, “прырода” і г. д. не дазваляе раскрыць унутраны свет асобы, яе адкрытасць праз злучэнне з іншым “Ты”, яе экзістэнцыяльную самоту і трывогу. У адрозненне ад класічнага тамізму нэатамісты прагнуць высветліць праблему сэнсу жыцця чалавека не статычна, а ў дынаміцы – праз дзеянне, працу, саўдзел, салідарнасць. Такія нэатамісты як Э. Жыльсан, Ж. Марытэн, К. Вайтыла, М. Кромпец, С.Свежаўскі абгрунтоўваюць думку, што новаеўрапейская парадыгма філасофствавання, якая эмансіпіруе чалавека, духоўна ізалюе яго як ад быцця Бога, так і ад абсалютнай ісціны. У рэальнасці ўсё гэта дэгуманізуе, знішчае чалавечую свабоду, а калі так, то і ўласную асабовасць чалавека. Творчасць нэатамістаў скіравана на крытыку канцэптуальных асноў структуралізма, канструктывізма, постмадэрнізма.